# Вольны птах беларускіх нябёсаў

**20 мая споўнілася 120 гадоў з дня нараджэння вядомага беларускага паэта Язэпа Пушчы. Да гэтай даты ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прайшоў круглы стол «Адысея Язэпа Пушчы», а ў зале беларускай літаратуры адкрылася выстава «Вольны птах беларускіх нябёсаў».**

На выставе прадстаўлены выданні паэта 1920 – 1930-х гг., а таксама апошнія прыжыццёвыя зборнікі 1960-х гг. Акрамя кніг дэманструюцца і дакументы паэта з 26-га фонду Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ), фонду Язэпа Пушчы. Ёсць яны таксама ў фондах 225 – «Маладняк»; 407 – «Адам Бабарэка» і інш. Адзінкавыя дакументы, падпісаныя Пушчам, захоўваюцца і ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь (ф. 4п. (фонд ЦК КПБ), воп. 1, спр. 2895 і 3080).

Язэп Пушча (сапр. Іосіф Паўлавіч Плашчынскі) быў адным з заснавальнікаў Усебеларускага аб'яднання паэтаў і пісьменнікаў «Маладняк», а таксама Беларускага літаратурна-мастацкага згуртавання «Узвышша». Калі гартаць дакументы фонду «Маладняк» у БДАМЛіМ – то заўважаеш, што шмат якія з іх падпісаў Язэп Пушча.

Пасля арышту ў 1930 г. і высылкі наш славуты паэт вымушаны быў працаваць бухгалтарам, рахункаводам і ў рэшце рэшт настаўнікам. Настаўніцтва было любімым заняткам Язэпа Пушчы. Ён вельмі любіў дзяцей і лёгка знаходзіў з імі агульную мову, станавіўся для сваіх вучняў сапраўдным сябрам.

Першы прамень надзеі на вяртанне да любімай настаўніцкай справы з'явіўся ў 1936 г., калі яго запрасілі на працу ў Шавыралаўскую сярэднюю школу. Праўда, адпрацаваў паэт там каля года і 28 чэрвеня 1937 г. быў пераведзены ў Манакоўскую сярэднюю школу Мурамскага раёна Уладзімірскай вобласці.

Менавіта ў Манакоўскай сярэдняй школе Язэп Пушча сапраўды адчуў сябе годным і вольным чалавекам. Там нішто не нагадвала паэту пра яго нядаўняе мінулае. Па выніках 1938/1939 навучальнага года ён нават атрымаў прэмію ў 200 рублёў. Для таго часу гэта былі вялікія грошы. А для былога палітвязня такая ўзнагарода – вельмі рэдкая з'ява.

Выстава складаецца з двух раздзелаў: «І супраць ветру ўзмахну крыламі» і «Зерне памяці». Сваёй мэтай я як куратар выставы паставіў поўнае раскрыццё жыцця і творчасці паэта. На вялікі жаль, Язэп Пушча не змог пасля сябе пакінуць вялікую спадчыну. Прычына – рэпрэсіі 1930-х – 1950-х гг. Але ўсё роўна ёсць што выдаваць і чым ганарыцца.

Адкрывае выставу двухтомнік паэта, складзены Л. Мазанік у 1993 – 1994 гг., у якім шмат твораў было надрукавана ўпершыню. Гэтая даследчыца адной з першых пачала карыстацца фондам Язэпа Пушчы ў БДАМЛіМе. Калі ўважліва паглядзець каментарыі да гэтага выдання, то словы «Друкуецца ўпершыню» сустракаюцца вельмі часта. Менавіта гэтым і карысны двухтомнік. Ён раскрывае сапраўднага Язэпа Пушчу. Л. Мазанік дасканала вывучыла ўсе нататнікі паэта, яго чарнавыя і чыставыя накіды. Такім чынам атрымалася вельмі багатае літаратурнае выданне. У гэтым зборы твораў чытач упершыню пазнаёміўся з успамінамі жонкі паэта Станіславы Шпакоўскай. Хаця на выставе прадстаўлена крыху больш за 70 выданняў, яна атрымалася змястоўнай.

Выстава працуе да 29 чэрвеня.

***Зміцер ДАВІДОЎСКІ***



Профессиональный Союз Работников Начальной и Средней Школы РСФСР Муромский Районный Комитет Горьковского края

25/VIII 1939 г.

СПРАВКА.

Выдана настоящая учителю Монаковской сред. школы товарищу Плашинскому в том, что он действительно премирован 200 руб. за успешную работу в 1938/1939 учебном году.

Выдана для занесения в трудовую книжку.

Пред. Райкома союза.

Секретарь:

*Даведка аб прэміраванні настаўніка Манакоўскай сярэдняй школы Плашчынскага «за успешную работу». 1939 г. З фондаў БДАМЛіМ.*



Усебеларускае аб'яднаньне поэтаў і пісьменьнікаў

МАЛАДНЯК

ЦЭНТРАЛЬНАЕ БЮРО

Менск, Рэволюцыйная 21
тэл. 7–71

„11" траўня 1925.
№

ВЫПІСКА

з пратаколу нарады ЦБ МАЛАДНЯКА ад 11 траўня 25 г.

I. Аб зацьверджаньні сяброў Віцебскай філіі МАЛАДНЯКА

I. Залічыць сапраўднымі сябрамі літаратурнай сэкцыі т.т.-
1. Касьпяровіч Мікола
2. Мурашкевіч Кузьма
3. Кашэль Хведар

Залічыць кандыдатамі у сябры літаратурнае сэкцыі:
1. Мазуркевіч Язэп
2. Варпаховіч Язэп
3. Базыліна Ганна
4. Жукоускі А
5. Катановіч Ахрэм
6. Лась П.А.
7. Бэкарэвіч Серафім

Залічыць сапраудным сябрам мастацкай сэкцыі т.т.
1. Семашкевіч

разам па Віцебскай філіі сяброу і кандыдатау адзінаццаць асоб.-

Адпаведны Сэкратар
Літсэкратар

*Адзін з дакументаў «Маладняка», падпісаны яго літсакратаром Язэпам Пушчам. 1925 г. З фондаў БДАМЛіМ.*